# 2011 ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ – БЕЛАРУСЬ

15-ы выпуск – чэрвень 2012

## УСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.9

**2011 Балы для Беларусі**




Асяродак, у якім працуюць беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці (АГС), значна пагоршыўся ў 2011 годзе пасля прэзідэнцкіх выбараў 19 снежня 2010 года. Па выніках масавых пратэстаў супраць фальсіфікацыі выбараў улады прынялі шэраг рэпрэсіўных законаў, пашырылі адміністратыўныя перашкоды і ўзмацнілі ціск на актывістаў і АГС. Эканамічны крызіс, які разгортваўся цягам года, прывёў да дэвальвацыі беларускага рубля, павелічэння коштаў і зніжэння рэальных прыбыткаў насельніцтва.

Нягледзячы на складаныя ўмовы дзейнасці, трэці сектар працягваў развіваць свой патэнцыял. АГС стваралі аналітычныя прадукты для карыстання з боку прадстаўнікоў трэцяга сектара, міжнароднай супольнасці, а ў некаторых выпадках і дзяржаўных органаў. У 2011 годзе павялічылася адвакатыўная здольнасць АГС і інтэнсіўнасць працы ў кааліцыях. АГС значна ў большай ступені пачалі выкарыстоўваць сацыяльныя медыя для паляпшэння якасці сваіх паслугаў, доступу да мэтавых групаў і прасоўвання свайго іміджу.




Паводле звестак на 31 снежня 2011 года, у краіне налічваліся 2,402 зарэгістраваныя грамадскія аб'яднанні, у тым ліку 230 міжнародных, 682 рэспубліканскіх і 1,490 мясцовых; 27 саюзы (асацыяцыі) грамадскіх аб'яднанняў; 119 фондаў. У 2011 годзе



было зарэгістравана 118 новых грамадскіх аб’яднанняў, у тым ліку 2 міжнародныя, 11 рэспубліканскіх і 105 мясцовых. Новыя арганізацыі ў пераважнай ступені маюць спартовы накірунак дзейнасці, за імі ідуць моладзевыя, культурныя, адукацыйныя, дабрачынныя арганізацыі. У 2011 годзе не было зарэгістравана ніводнай праваабарончай арганізацыі.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 6.9




Пасля гвалтоўнага разгону мірных масавых пратэстаў 19 снежня 2010 года ўлады зрабілі шэраг палітычна матываваных, рэпрэсіўных захадаў супраць актывістаў і АГС, якія былі задзейнічаныя ў выбарчай кампаніі, у тым ліку дэмакратычных кандыдатаў, праваабарончых арганізацый, незалежнай адвакатуры і незалежных сродкаў масавай інфармацыі. Цягам першых трох месяцаў 2011 года прыкладна ў 170 офісах і прыватных памяшканнях былі праведзеныя вобшукі, больш за 200 актывістаў былі апытаныя па справе паслявыбарных пратэстаў. Вынікам судовых пасяджэнняў, якія прайшлі ў лютым-сакавіку, сталіся выракі 43 актывістам, у тым ліку пяці кандыдатам у прэзідэнты, паводле крымінальных артыкулаў за арганізацыю і ўдзел у масавых закалотах. Напрыканцы 2011 года, пасля шэрагу прэзідэнцкіх памілаванняў, яшчэ 11 палітычных вязняў па справе снежаньскіх пратэстаў заставаліся за кратамі.

АГС павінны рэгістраваць замежную дапамогу ў адпаведных дзяржаўных органах, працэдура застаецца складанай і часта прыводзіць да адмовы ў рэгістрацыі. Закон “Аб грамадскіх аб’яднаннях” забараняе дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, за парушэнне дадзенага палажэння прадугледжваецца штраф ці арышт паводле артыкула 1931 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь. У 2011 годзе пракуратура вынесла афіцыйныя папярэджанні двум актывістам за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый. Неспрыяльны прававы асяродак прымушае АГС да выбару – спыняць сваю дзейнасць ці парушаць законы.

Арганізацыі і актывісты, якія публічна крытыкуюць дзеянні ўлады, падпадаюць пад адміністратыўны пераслед. Цягам 2011 года больш за 800 грамадзян былі затрыманыя, дапытаныя, аштрафаныя ці арыштаваныя ад трох да пятнаццаці сутак. У кастрычніку 2011 года праваабаронца Валянцін Стэфановіч быў аштрафаваны за нясплочаныя падаткі. Падатковая інспекцыя таксама чыніла пераслед іншым арганізацыям і актывістам. Сярод адміністратыўных бар’ераў для АГС фіксаваліся адмовы ў арэндзе памяшканняў для правядзення публічных мерапрыемстваў і канферэнцый.

Найбольш заўважнай падзеяй 2011 года стаўся судовы вырак у дачыненні да старшыні Праваабарончага цэнтра “Вясна” Алеся Бяляцкага. 24 лістапада Бяляцкі быў асуджаны да 4,5 гадоў турэмнага зняволення і канфіскацыі маёмасці за ўхіленне ад выплаты падаткаў. Падставай для абвінавачвання сталіся звесткі пра тое, што праваабаронца меў асабістыя рахункі ў еўрапейскіх банках, на якія атрымліваў замежныя сродкі на статутную дзейнасць арганізацыі. Зняволенне Бяляцкага сталася папярэджаннем для праваабарончых арганізацый і грамадскага сектара ў цэлым.

Працэдура рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў у Міністэрстве юстыцыі і яго рэгіянальных упраўленнях па-ранейшаму застаецца працяглай па часе і патрабуе значных грашовых выдаткаў, таму некаторыя арганізацыі абіраюць іншыя арганізацыйна-прававыя формы. Беларускія АГС легалізуюцца ў выглядзе некамерцыйных установаў, рэгістрацыя якіх адбываецца паводле заяўляльнага прынцыпу пры мясцовых выканкамах. Сёлета ў форме некамерцыйнай установы былі зарэгістраваныя, да прыкладу, арганізацыя па абароне правоў зняволеных "Платформа", Офіс па правах людзей з інваліднасцю, арганізацыя па абароне правоў аўтамабілістаў "За Аўто" і г.д. Іншыя АГС рэгіструюцца за мяжой, хаця гэта не дае ім права дзейнічаць афіцыйна на тэрыторыі Беларусі. Тым не менш, легальны статус за мяжой абараняе сябраў АГС ад пагрозы быць абвінавачанымі ў дзейнасці ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а таксама дазваляе мець празрыстыя стасункі з міжнароднымі донарамі і партнёрамі. У 2011 годзе Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый зарэгістравалася ў Літве пасля трох няўдалых спробаў атрымаць легальны статус у Беларусі. У той жа час многія АГС абіраюць шлях не рэгістравацца зусім, нягледзячы на тое, што тым самым парушаюць беларускае заканадаўства.

Працэдура рэгістрацыі застаецца непразрыстай і залежнай ад палітычных фактараў. Да прыкладу, калі старшыня Цэнтра развіцця валанцёрства адмовіўся супрацоўнічаць з КДБ, арганізацыі было адмоўлена ў рэгістрацыі. Органы юстыцыі не пайшлі насустрач спробам зарэгістравацца з боку такіх арганізацый, як "Гавары праўду!" (двойчы цягам года), "Маладыя Дэмакраты", "Залаты леў". Рэгіянальныя аддзяленні Руху "За свабоду" ў Мінску, Брэсце і Магілёве таксама не здолелі легалізавацца ў 2011 годзе.

Напрыканцы лістапада 2011 года пачаў дзейнічаць шэраг новых заканадаўчых актаў. Папраўкі ў Закон "Аб масавых мерапрыемствах" значна абмежавалі правы грамадзян на мірныя сходы; папраўкі ў Закон "Аб грамадскіх аб'яднаннях" увялі крымінальную адказнасць для арганізацый за парушэнне парадку атрымання замежнай дапамогі. Працэс прыняцця заканадаўчых новаўвядзенняў быў непразрыстым для грамадскасці. Без папярэдняга грамадскага абмеркавання папраўкі былі прынятыя за адзін дзень у двух чытаннях Палатай прадстаўнікоў. Рэпрэсіўныя папраўкі былі таксама ўнесеныя ў Закон "Аб палітычных партыях", Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях, Выбарчы кодэкс, Крымінальны кодэкс.

З пазітыўнага боку, у 2011 годзе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пры дапамозе АГС распрацавала новыя раздзелы ў Закон "Аб сацыяльным абслугоўванні". Праект закона ўпершыню дазволіць дзяржаўных органам заключаць дамовы з АГС на аказанне сацыяльных паслугаў, што адкрывае, такім чынам, крыніцу дзяржаўнага фінансавання для трэцяга сектара. Законапраект перададзены ў Палату прадстаўнікоў і мусіць быць прыняты ў 2012 годзе.

АГС не маюць падатковай палёгкі і мусяць сплочваць падаткі, у тым ліку на замежную дапамогу. Аднак пры ўмове рэгістрацыі замежнага гранта АГС могуць быць вызваленыя да 30% падаткаў ад агульнай сумы. Прававы асяродак не прадугледжвае падатковых ільгот для мясцовых карпаратыўных і індывідуальных донараў, а АГС не маюць права весці ўласную гаспадарчую дзейнасць.

У рэгіёнах працуе абмежаваная колькасць юрыстаў, абазнаных у некамерцыйным праве. Юрыдычныя паслугі для АГС збольшага даступныя ў Мінску і абласных цэнтрах.

## АРГАНІЗАЦЫЙНАЕ РАЗВІЦЦЁ: 5.1




Усё большая колькасць АГС праводзяць даследаванні для паляпшэння працы з мэтавымі групамі. Да прыкладу, Офіс па правах людзей з інваліднасцю вывучыў патрэбы людзей з абмежаванымі магчымасцямі і выкарыстаў атрыманую інфармацыю, каб распрацаваць інфармацыйную кампанію па пераадоленню бар'ераў для гэтай катэгорыі насельніцтва. Тым не менш, АГС маюць складанасці па прыцягненні мэтавых групаў да актыўнага ўдзелу ў планаванні і рэалізацыі праектаў. Некаторыя АГС факусуюцца на мэтавай аўдыторыі, якую вызначаюць донары. Больш за тое, частка АГС, якія маюць фінансаванне з-за мяжы, разглядаюць сваіх донараў як прыярытэтныя мішэні.

АГС разумеюць важнасць стратэгічнага планавання, аднак стратэгічнае планаванне і рэалізацыя яго ных вынікаў ускладняюцца нестабільным і часта варожым асяродкам, у якім працуюць АГС.

Усе зарэгістраваныя АГС маюць прапісаны ў статутных дакументах падзел улады і абавязкаў, што, аднак, не заўсёды адпавядае рэчаіснасці. Буйныя АГС маюць адносна эфектыўныя ўпраўленчыя сістэмы, адаптаваныя да беларускай рэчаіснасці, спрабуюць быць дэмакратычнымі і празрыстымі, хаця часам гэта з'яўляецца складанай задачай, улічваючы неспрыяльны асяродак. У большасці невялікіх арганізацый лідэры выконваюць усе абавязкі.

Зусім невялікая колькасць АГС маюць сродкі на ўтрыманне пастаяннага штату. Як правіла, персанал мае заробак, закладзены ў праектах; пры адсутнасці бягучых праектаў спецыялісты часта працуюць як валанцёры. АГС прапануюць неканкурэнтныя заробкі і сацыяльныя пакеты, у выніку чаго сябры АГС вымушаны працаваць у іншых сектарах.

Многія АГС маюць офіснае абсталяванне, але памяшканні па-ранейшаму застаюцца праблемным месцам – арэнда офіса каштуе шмат, а ўласнікі часта не жадаюць здаваць памяшканні для АГС. АГС таксама не хапае ліцэнзаванага праграмнага забеспячэння, неабходнага для працы.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6.5




Фінансавая ўстойлівасць беларускіх АГС застаецца нетрывалай. Многія АГС залежаць ад падтрымкі аднаго замежнага донара. Так, ВІЧ-сервісныя арганізацыі маюць фінансаванне выключна ад Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, сухотамі і малярыяй. Праўда, частка АГС атрымліваюць значныя рэсурсы з мясцовых крыніц.

У сакавіку 2011 года Еўрапейская камісія абвясціла, што павялічвае сваю падтрымку грамадзянскай супольнасці Беларусі ў 2011-2013 гг. Аднак публічных фактаў выкарыстання гэтага фінансавання няма. Донарскія каардынацыйныя сустрэчы адбываюцца рэгулярна, але ж каардынацыя атрымліваецца незаўважнай з меркаванняў бяспекі.

Нягледзячы на недахоп заканадаўчай падтрымкі дабрачыннасці, некаторыя АГС дасягнулі значных поспехаў у мясцовым фандрайзінгу. Да прыкладу, Беларускі дзіцячы хоспіс мае 60% свайго фінансавання з мясцовых крыніц, у тым ліку з індывідуальных і карпаратыўных ахвяраванняў. Беларускі дзіцячы хоспіс, Саюз сястрынстваў міласэрнасці Беларускай Праваслаўнай Царквы, “Здароўе ў 21 стагоддзе” прыцягваюць сродкі праз тэлефанаванні грамадзян. Дзякуючы арганізацыі “Здароўе ў 21 стагоддзе”, насельніцтва можа ахвяраваць на патрэбы АГС праз банкаматы “Беларусбанка”. У 2011 годзе быў створаны фонд “Ідэя”, мэтай якога з’яўляецца развіццё сацыяльнай адказнасці сярод мясцовага бізнеса.

Галоўнай крыніцай мясцовай падтрымкі для большасці АГС застаецца валанцёрская праца і сяброўскія ўнёскі. У гэтым сэнсе найбольш паспяховымі з’яўляюцца бізнес асацыяцыі, у бюджэтах якіх сяброўскія ўнёскі складаюць да 50%. Аднак для большасці АГС сяброўскія ўнёскі з’яўляюцца не столькі крыніцай фінансавання, колькі фармаваннем пачуцця прыналежнасці да арганізацыі.

АГС не маюць права атрымліваць прыбытак з продажу сваіх паслугаў. Частка АГС прадае паслугі, ангажуючы кліентаў у сябры арганізацыі і збіраючы з іх плату ў выглядзе сяброўскіх унёскаў. Адзіны легальны шлях для АГС зарабляць грошы – гэта стварэнне незалежнай камерцыйнай інстытуцыі, што аднак не з’яўляецца агульнапрынятай практыкай. Беларуская асацыяцыя дапамогі дзецям-інвалідам і маладым інвалідам стварыла чатыры камерцыйныя арганізацыі – сацыяльныя прадпрыемствы – для працаўладкавання маладых людзей з інваліднасцю. Аднак, без дзяржаўнай падтрымкі такія сацыяльныя прадпрыемствы маюць невялікі шанец на выжыванне ва ўмовах рынку.

Пераважная большасць АГС не маюць дзяржаўнага фінансавання, за выключэннем так званых дзяржаўна-грамадскіх аб’яднанняў. У 2011 годзе мясцовыя выканаўчыя камітэты на конкурснай аснове выдалі гранты ВІЧ-сервісным арганізацыям у чатырох гарадах Гомельскай вобласці з супольным фінансаваннем Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, сухотамі і малярыяй. Прыкладна 450 АГС маюць арэндную ільготу для сваіх офісаў у памяшканнях дзяржаўнай формы ўласнасці. Аднак не існуе зразумелых крытэрыяў, паводле якіх дзяржаўныя органы прымаюць рашэнне аб ільготнай арэндзе для той ці іншай арганізацыі.

Многія арганізацыі, якія атрымліваюць фінансаванне з міжнародных крыніц, маюць добра наладжаны фінансавы менеджмент і сістэму справаздачнасці. У той жа час большасць АГС не маюць незалежнага фінансавага аўдыту, і толькі адзінкавыя АГС робяць публічнымі свае штогадовыя фінансавыя справаздачы.

# АДВАКАТАВАННЕ: 5.8




Складаныя ўмовы, паствыбарныя рэпрэсіі не адбіліся негатыўным чынам на адвакатыўным патэнцыяле АГС. Беларускія арганізацыі працягвалі свае адвакатыўныя намаганні, дэманструючы пэўныя поспехі цягам года.

У сакавіку 2011 года 112 АГС, якія аб'ядноўваюць каля 270 тыс. сябраў, накіравалі калектыўны зварот у Палату Прадстаўнікоў і Савет Міністраў, выказваючы нязгоду з законапраектам "Аб некамерцыйных арганізацыях". У выніку законапраект, які мусіў пагоршыць умовы дзейнасці АГС, быў зняты з парадку дня. У кастрычніку 2011 года 25 беларускіх АГС падпісаліся пад зваротам да ўладаў, спрабуючы папярэдзіць заганныя папраўкі ў Закон "Аб масавых мерапрыемствах", Закон "Аб грамадскіх аб'яднаннях" і інш. Аднак гэтыя намаганні не мелі поспеху, і рэпрэсіўныя папраўкі былі прынятыя.

Дзякуючы ініцыятыве жаночых і праваабарончых арганізацый, у 2011 годзе пад эгідай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пачалася распрацоўка першай у гісторыі краіны Канцэпцыі па забеспячэнні гендэрнай роўнасці. Арганізацыя "Маці супраць наркотыкаў" прапанавала змены ў заканадаўства, якія павінны замяніць крымінальнае пакаранне нарказалежных на лячэнне і рэабілітацыю; прапанова знаходзіцца на разглядзе ў дзяржаўных інстанцыях.

Аднымі з самых паспяховых у прасоўванні сваіх інтарэсаў з'яўляюцца бізнес асацыяцыі. Для рэалізацыі Нацыянальнай платформы развіцця бізнесу, якая ўяўляе сабой прапановы па паляпшэнню бізнес клімату ў краіне, была створана працоўная група з ліку чыноўнікаў і бізнесоўцаў. У 2011 годзе ўрад падтрымаў каля 35% прапаноў з боку Платформы, у тым ліку змены ў Падатковы кодэкс, палажэнні аб стымуляванні экспарту прадукцыі і паслугаў малога і сярэдняга бізнесу. Цяпер бізнес пачынае ўспрымаць АГС як канал прасоўвання сваіх інтарэсаў. Да прыкладу, бізнес асацыяцыі ўносілі свае прапановы ў праект Закона "Аб папярэджанні гандлю людзьмі" праз грамадскую арганізацыю, якая з'яўляецца сябрам працоўнай групы па распрацоўцы гэтага законапраекта.

Грамадскія рады створаны пры дзяржаўных органах рознага ўзроўню па ўсёй Беларусі, аднак прадстаўніцтва АГС у іх нязначнае. Многія рады не дзейнічаюць – так, Рада грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці сёлета не збіралася, а Грамадска-кансультатыўная рада пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусі была скасаваная.

У 2011 годзе значна павялічыўся адвакатыўны патэнцыял АГС на міжнародным узроўні. АГС прымалі супольныя заявы ў адказ на падзеі ўнутры краіны і за яе межамі, выкарыстоўвалі дапамогу замежных партнёраў, пераважна еўрапейскіх, каб уплываць на сітуацыю ў Беларусі. Да прыкладу, у часе штогадовай сустрэчы АБСЕ у галіне чалавечага вымярэння ў Варшаве, беларускія АГС прыцягнулі ўвагу да факта крымінальнага пераследу праваабаронцы Алеся Бяляцкага, а таксама зладзілі секцыю па тэме "Свабода аб'яднанняў у Беларусі".

У 2011 годзе назіраўся ўздым салідарнасці і актыўнасці сярод беларускіх грамадзян, якія дапамагалі грашыма і іншымі сродкамі ўдзельнікам пратэстаў супраць фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў, Рэвалюцыі праз сацыяльныя сеткі (шэраг вулічных акцый супраць палітыкі ўраду, якая прывяла да фінансавага і эканамічнага крызісу), акцыі “Стоп Бензін” (грамадзянская ініцыятыва супраць павышэння коштаў на паліва).

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.5




АГС аказваюць разнастайныя паслугі ў такіх сферах, як грамадзянская адукацыя, працаўладкаванне і рэабілітацыя людзей з інваліднасцю, прафілактыка ВІЧ, арганізацыя вольнага часу для моладзі, замежныя візіты, псіхалагічная і сацыяльная падтрымка групаў рызыкі, экалагічныя акцыі, прававая дапамога. АГС імкнуцца распрацоўваць свае праграмы і сервісы з улікам вывучэння патрэбаў мэтавых групаў, але гэтая практыка пакуль не з’яўляецца пашыранай.

У 2011 годзе АГС зрабілі шэраг аналітычных публікацый датычна ўнутрысектарных і нацыяльных пытанняў. Лідэрамі ў гэтай сферы з’яўляюцца фабрыкі думкі, да прыкладу, Беларускі інстытут палітычных даследаванняў, і незалежныя сацыялагічныя цэнтры, да прыкладу, Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў.

Беларускія АГС пашыраюць сваю экспертызу на міжнародным узроўні, у тым ліку ў форме альтэрнатыўных дакладаў па актуальных пытаннях. Так, праваабарончыя арганізацыі прэзентавалі свой Даклад па катаваннях у беларускіх турмах на пасяджэнні Камітэта па правах чалавека ААН у Жэневе.

АГС прапануюць паслугі такім групам рызыкі, як ахвяры гвалту, нарказалежныя, людзі з абмежаванымі магчымасцямі, але гэтыя сервісы не з’яўляюцца ўстойлівымі. Кошт такіх паслугаў высокі, а донары з’яўляюцца адзінай рэалістычнай крыніцай фінансавання – АГС забаронена мець прыбытак ад продажу паслугаў, а дзяржаўную падтрымку ў пераважнай ступені маюць толькі дзяржаўна-грамадскія арганізацыі. Бізнес у сваю чаргу звычайна ахвяруе ці непасрэдна прадстаўнікам групаў рызыкі, ці на рахунак дзяржаўных сацыяльных інстытуцый кшталту дзіцячых дамоў і шпіталяў. У выніку, часта АГС вымушаны спыняць свае паслугі разам з заканчэннем праекта.

## ІНФРАСТРУКТУРА: 5.4




Шэраг арганізацый пашыраюць інфармацыю сярод іншых АГС. Так, Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый, Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў, Асацыяцыя “БелСетка АнтыСНІД”, Гродзенскі цэнтр “Трэці сектар” рэгулярна распаўсюджваюць інфармацыйныя рассылкі і бюлетэні. Некаторыя рэгіянальныя арганізацыі працуюць як

рэсурсовыя цэнтры і падтрымліваюць інстытуцыянальнае развіццё арганізацый і ініцыятываў, сярод іх Асацыяцыя дзяцей і моладзі (АСДЕМА) і Гомельскі дэмакратычны форум у Гомелі, “Дзедзіч” у Брэсце, “Трэці сектар” у Гродна, шэраг арганізацый у Мінску, такіх як Адукацыйны цэнтр “ПОСТ”.

У Беларусі падрыхтаваная дастатковая колькасць трэнераў па асновах дзейнасці АГС, але існуе дэфіцыт кадраў, асабліва ў рэгіёнах, па такіх актуальных тэмах, як прававыя пытанні, фінансавы менеджмент, адвакатаванне, маніторынг і ацэнка. Трэнінгі даступныя таксама на беларускай мове, але попыт на іх зніжаецца ў звязку з дыскрымінацыяй нацыянальнай мовы на дзяржаўным узроўні.

АГС пераразмяркоўваюць грошы замежных фондаў цягам некалькі год, але гэтая практыка не з’яўляецца празрыстай. У 2011 годзе, аднак, некалькі арганізацый пачалі легальна выкарыстоўваць рэгрантынгавыя схемы для сацыяльных дзяржаўных інстытуцый і АГС. Да прыкладу, міжнародная арганізацыя “Узаемаразуменне” пераразмяркоўвае грошы нямецкага фонду “Памяць, адказнасць і будучыня”; міжнародная арганізацыя “АКТ” здзяйсняе рэгрантынг сродкаў Глабальнага фонду па барацьбе са СНІДам, сухотамі і малярыяй.

Нацыянальная платформа Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга Партнёрства – супольная платформа для кансалідацыі і каардынацыі намаганняў беларускіх АГС – у 2011 годзе пачала працэс сваёй інстытуалізацыі. У кастрычніку ўдзельнікі Платформы прынялі Мемарандум, які адлюстраваў яе базавыя прынцыпы, каштоўнасці і задачы. Платформа таксама абрала Часовы кіроўны камітэт.

Узаемадзеянне паміж уладамі і АГС залежыць хутчэй ад персанальных сувязяў, у той час як палітычная воля да супрацы практычна адсутнічае. Час ад часу ўрад выкарыстоўвае экспертызу і прадукты АГС у сваіх дакументах і дакладах, але часта без спасылкі на АГС. Бізнес асацыяцыі ўключаны ў экспертныя рады па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці пры міністэрствах; яны ладзяць сумесныя канферэнцыі, кірмашы для прыцягнення інвестыцыі і прасоўвання інавацый. Супраца паміж АГС і бізнесам застаецца нязначнай.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.9




Рэпрэсіі пасля прэзідэнцкіх выбараў узмацнілі імідж АГС, асабліва арганізацый праваабарончага накірунку. Праваабаронцы былі адзінай крыніцай інфармацыі па затрыманых удзельніках снежаньскіх пратэстаў. Паглыбленая незадаволенасць урадам і эканамічны крызіс сталіся прычынай павелічэння колькасці сябраў і валанцёраў у моладзевых арганізацыях і бізнес асацыяцыях.

Сродкі масавай інфармацыі па-ранейшаму асвятляюць дзейнасць АГС на нездавальняючым узроўні. Дзяржаўныя медыя даюць негатыўную, прадузятую інфармацыю пра АГС і іх дзейнасць, асабліва датычна праваабарончых арганізацый. Прыватныя і незалежныя медыя, у тым ліку друкаваныя выданні, онлайн рэсурсы,

тэлевізійны канал Белсат і радыё станцыі, даюць станоўчае інфармаванне пра АГС, але нерэгулярна і без належнай аналітыкі.

АГС не інфармуюць грамадскасць пра сваю дзейнасць пастаянна і інтэнсіўна з прычыны адсутнасці неабходных рэсурсаў ці з меркаванняў бяспекі. Як правіла, АГС не маюць у сваім штаце спецыяліста па сувязях з грамадскасцю; вельмі малая колькасць арганізацый развівае і рэалізуе піяр стратэгіі. Прыклад Асацыяцыі "БелСетка АнтыСНІД" з'яўляецца адным з выключэнняў, паколькі праектнае фінансаванне дазваляе ёй мець эксперта для рэалізацыі адзінай інфармацыйнай стратэгіі для ВІЧ-сервісных арганізацый.

Прэзідэнцкі дэкрэт №60, прыняты ў лютым 2010 года, стаўся прычынай стварэння "чорнага спісу" сайтаў, доступ да якіх адключаны ў дзяржаўных установах. Спіс з 60 забароненых сайтаў уключае парталы незалежных навінаў Хартыя 97 і Беларускі партызан, а таксама сайт Праваабарончага цэнтра "Вясна".

У 2011 годзе АГС пачалі пашыраць сваю працу і паляпшаць імідж праз выкарыстанне сацыяльных медыя. Онлайн ініцыятыва "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" з дапамогай расійскай сеткі VKontakte вывела на вуліцы тысячы пратэстоўцаў супраць палітычнага рэжыму і сацыяльна-эканамічнай палітыкі ўраду.

У 2011 годзе ўспрыняцце АГС з боку дзяржавы прынцыпова не змянілася. Улады паранейшаму крытычна ставяцца да АГС і ўспрымаюць іх хутчэй як пагрозу. У цэлым, бізнес не заўважае АГС і таму не разглядае іх у якасці партнёраў ці патэнцыйных атрымальнікаў ахвяраванняў.

Сектар АГС застаецца непразрыстым і не мае адзінага этычнага кодэкса. Толькі адзінкавыя АГС робяць публічнымі штогадовыя справаздачы, у якія, аднак, не ўключаюць поўную фінансавую інфармацыю.

Індэкс устойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці (АГСІУ) з'яўляецца ключавым інструментам вымярэння прагрэсу грамадскага сектара ў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропе і Еўразіі (E&E рэгіён). Індэкс адсочвае прагрэс грамадскага сектара ў 29 краінах цягам апошніх пятнаццаці год. Індэкс вывучае агулам варункі, якія спрыяюць развіццю грамадзянскай супольнасці, надаючы асаблівую ўвагу прававому асяродку для дзейнасці няўрадавых арганізацый, арганізацыйнаму развіццю, фінансавай устойлівасці, адвакатаванню, аказанню паслугаў, інфраструктуры і грамадскаму іміджу. Кожнае вымярэнне рэйтынгуецца паводле сямібальнай шкалы, дзе 1 паказвае на вельмі прагрэсіўны ўзровень, а 7 – на нізкі ўзровень развіцця. Індэкс распрацаваны Агенцтвам ЗША па міжнародным развіцці ў партнёрстве з мясцовымі арганізацыямі ў кожнай з тых краін, дзе вымяраецца Індэкс.

Для атрымання падрабязнай інфармацыі, калі ласка, звяртайцеся ў Міжнароднае асветніцкае грамадскае аб'яднанне "АКТ", actngo.info@gmail.com

Англійская версія Індэкса ўстойлівасці арганізацый грамадзянскай супольнасці 2011 для Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі даступная для азнаямлення па спасылцы: http://transition.usaid.gov/locations/europe_eurasia/dem_gov/ngoindex/

# 2011 БАЛЫ ІНДЭКСА ЎСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ (АГС)

| КРАІНА | Прававы асяродак | Арганізацыйнае развіццё | Фінансавая ўстойлівасць | Адвакатаванне | Аказанне паслугаў | Інфраструктура | Грамадскі імідж | АГС устойлівасць |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ПАЎНОЧНЫ РЭГІЁН | | | | | | | | |
| Чэхія | 2.8 | 3.0 | 3.2 | 2.1 | 2.4 | 2.8 | 2.4 | 2.7 |
| Эстонія | 1.7 | 2.3 | 2.4 | 1.7 | 2.3 | 1.6 | 1.9 | 2.0 |
| Венгрыя | н/в | н/в | н/в | н/в | н/в | н/в | н/в | н/в |
| Латвія | 2.3 | 3.0 | 3.3 | 2.1 | 2.5 | 2.4 | 3.2 | 2.7 |
| Літва | 2.2 | 2.9 | 3.2 | 2.0 | 3.4 | 3.0 | 2.6 | 2.8 |
| Польшча | 2.2 | 2.6 | 2.7 | 1.7 | 2.2 | 1.7 | 2.2 | 2.2 |
| Славакія | 2.8 | 3.0 | 3.4 | 2.5 | 2.5 | 2.3 | 2.4 | 2.7 |
| Славенія | 3.3 | 3.8 | 4.4 | 3.5 | 3.5 | 3.6 | 3.7 | 3.7 |
| *Сярэдні бал* | **2.5** | **2.9** | **3.2** | **2.2** | **2.7** | **2.5** | **2.6** | **2.7** |
| ПАЎДНЁВЫ РЭГІЁН | | | | | | | | |
| Албанія | 3.9 | 3.9 | 4.6 | 3.6 | 3.7 | 4.0 | 3.8 | 3.9 |
| Боснія | 3.4 | 3.4 | 4.8 | 3.1 | 3.9 | 3.8 | 3.3 | 3.7 |
| Балгарыя | 2.2 | 4.4 | 4.6 | 2.7 | 3.2 | 3.3 | 3.2 | 3.4 |
| Харватыя | 2.9 | 3.0 | 4.3 | 3.1 | 3.2 | 2.7 | 3.0 | 3.2 |
| Косава | 3.5 | 3.8 | 4.7 | 3.8 | 3.9 | 3.7 | 3.8 | 3.9 |
| Македонія | 3.2 | 3.7 | 4.5 | 3.3 | 3.8 | 3.3 | 4.0 | 3.7 |
| Чарнагорыя | 3.5 | 4.3 | 4.9 | 3.5 | 4.0 | 3.9 | 4.3 | 4.1 |
| Румынія | 3.6 | 3.5 | 4.3 | 3.4 | 3.1 | 3.2 | 3.6 | 3.5 |
| Сербія | 4.1 | 4.3 | 5.4 | 3.6 | 4.2 | 3.7 | 4.5 | 4.3 |
| *Сярэдні бал* | **3.4** | **3.8** | **4.7** | **3.3** | **3.7** | **3.5** | **3.7** | **3.7** |
| ЕЎРАЗІЯ: Расія, Заходнія краіны СНД і Каўказ | | | | | | | | |
| Арменія | 3.9 | 3.9 | 5.2 | 3.4 | 3.9 | 3.5 | 4.0 | 4.0 |
| Азербайджан | 4.7 | 4.5 | 5.5 | 4.6 | 4.6 | 4.4 | 4.8 | 4.7 |
| Беларусь | 6.9 | 5.1 | 6.5 | 5.8 | 5.5 | 5.4 | 5.9 | 5.9 |
| Грузія | 3.3 | 4.1 | 5.0 | 4.3 | 4.1 | 4.3 | 4.1 | 4.2 |
| Малдова | 4.2 | 4.0 | 5.0 | 3.6 | 4.4 | 3.6 | 4.0 | 4.1 |
| Расія | 4.5 | 4.3 | 4.8 | 4.0 | 4.2 | 4.0 | 4.7 | 4.4 |
| Украіна | 3.5 | 3.5 | 4.3 | 2.6 | 3.3 | 3.4 | 3.6 | 3.5 |
| *Сярэдні бал* | **4.4** | **4.2** | **5.2** | **4.0** | **4.3** | **4.1** | **4.4** | **4.4** |
| ЦЭНТРАЛЬНАЯ АЗІЯ | | | | | | | | |
| Казахстан | 3.9 | 4.2 | 4.6 | 3.9 | 4.0 | 3.7 | 4.1 | 4.1 |
| Кыргызстан | 3.9 | 4.3 | 5.3 | 3.2 | 4.0 | 3.7 | 4.1 | 4.1 |
| Таджыкістан | 4.9 | 4.5 | 5.6 | 4.8 | 4.4 | 4.5 | 4.5 | 4.7 |
| Туркменістан | 6.2 | 5.3 | 6.0 | 6.0 | 5.2 | 5.2 | 5.5 | 5.6 |
| Узбекістан | 6.0 | 5.5 | 6.2 | 5.9 | 5.4 | 5.6 | 5.6 | 5.7 |
| *Сярэдні бал* | **5.0** | **4.8** | **5.5** | **4.8** | **4.6** | **4.5** | **4.8** | **4.8** |
| *Еўразія і Цэнтральная Азія Сярэдні бал* | **4.7** | **4.4** | **5.3** | **4.3** | **4.4** | **4.3** | **4.6** | **4.6** |

Н/В = Праз арганізацыйныя праблемы адзнакі не былі выстаўленыя